13. Протоколы Ісъезда архивных деятелей РСФСР. 14–19 марта 1925 года / ЦентрархивРСФСР. Ред. Н. Ф. Бельчикова, В. В. Максакова. М., 1926. 312 с.

14. *Назин И., Доброва З.* Провениенцпринцип в построении архивного фонда // Архивное дело. 1937. № 1 (42). С. 56–68.

15. *Чабров Г. Н.* К вопросу о систематизации архивных материалов // Ленинградский архивист. 1935. № 1. С. 64–83.

16. *Бржостовская Н. В.* Архивы и архивное дело в зарубежных странах (История и современная организация) / Учеб. пособие. Под ред. Ю. Ф. Кононова. М., 1971. 219 с.

17. *Старостин Е.* В. Западноевропейская историография архивоведения (конец XIX – первая треть XX в.) // Советские архивы. 1985. № 3. С. 70–77.

18. *Автократов В. Н.* Понятие происхождения в архивоведении // Археографический ежегодник за 1978 год / АН СССР. Отделение истории. Археограф. комис. ; редкол. С. О. Шмидт [и др.]. М. : Наука, 1979. С. 142–149.

19. *ХорхординаТ. И.* История Отечества и архивы. 1917–1980-е гг. М., 1994. 357 с.

20. *Мацяш І. Б.* Архівознавство: методологічні засади та історія розвитку К., 2012. 515 с.

21. Архівазнаўства: дапаможнік / А. М. Бяляўскі і інш. ; пад рэд. М. Ф. Шумейкі. Мінск : БДУ. 2013. 415 с.

***Каханоўскі А. Г.***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт* (*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*)

## АГРАРНЫ КРЫЗІС 80-х гг. XIX ст. І ТРАНСФАРМАЦЫЙНЫЯ ЗМЕНЫ Ў БЕЛАРУСКАЙ ВЁСЦЫ

У другой палове XX ст. адным з перспектыўных кірункаў у айчыннай гістарыяграфіі стала вывучэнне працэсаў сацыяльна-эканамічнага развіцця беларускай вёскі. Намаганнямі, перш за ўсё, акадэмічных даследчыкаў сфарміравалася навуковая школа па аграрнай гісторыі, якая мела прызнанне ў калег з суседніх краін. Аднак у апошнія дзесяцігоддзі той патэнцыял страчаны і толькі намаганнямі ўніверсітэцкіх гісторыкаў ідзе аднаўленне цікавасці да вывучэння эканамічнай гісторыі Беларусі. Але нават у лепшыя часы па-за ўвагай даследчыкаў засталося скрупулёзнае вывучэнне праяў сусветнага аграрнага крызісу канца XIX ст. на тэрыторыі Беларусі і яго ўплыву на мясцовыя гаспадарчыя і сацыяльныя працэсы.

Сусветны аграрны крызіс пачаўся ў 1873 г. Яму папярэднічала хуткае развіццё земляробства ў ЗША, Аўстраліі, Канадзе, некаторых краінах Лацінскай Амерыкі, якое аказалася больш эфектыўным, чым у

традыцыйных пастаўшчыкоў збожжа. У выніку рэзка ўзрасла сусветная вытворчасць хлеба. Вялікую ролю ва ўзнікненні крызісу адыграла значнае ўдасканаленне транспартнай сістэмы, што дазваляла хутка і танна дастаўляць зерне з Амерыкі ў Еўропу. Пачалося падзенне цэн на хлеб на еўрапейскіх рынках. Аграрны крызіс закрануў Расійскую імперыю некалькі пазней, чым краіны Заходняй Еўропы. Складанасці ў збыце збожжа тут узніклі з канца 1870-х гг., а з 1881 г. пачалося падзенне хлебных цэн, якое прадаўжалася, за выключэннем некалькіх гадоў, да канца 1897 г. Напярэдадні крызісу ў Расійскай імперыі значна вырасла зернявая гаспадарка, з'явіліся новыя збожжавыя раёны, што стымулявалася высокім узроўнем цэн на хлеб у самой Расіі, а таксама за мяжой. У сувязі з падзеннем цэн вытворцы земляробчай прадукцыі з беларускіх губерняў аказаліся не ў стане канкурыраваць з больш танным зернем з Амерыкі і поўдня Расіі. Геаграфічная блізкасць Беларусі да рынкаў збыту сельскагаспадарчай прадукцыі вызначыла тут спецыфіку развіцця крызісу. Ён праявіў сваё ўздзеянне ў беларускіх губернях раней, чым у другіх рэгіёнах Расійскай імперыі, і аказаў больш значны ўплыў на далейшае развіццё сельскай гаспадаркі. Рэзкія спады хлебных цэн і адпаведна вывазнога гандлю збожжам адбыліся ў 1887–1888 гг. і 1894–1895 гг. На развіццё хлебнага гандлю адмоўна паўплывала тарыфная палітыка расійскага ўрада. Перагляд збожжавых тарыфаў у 1889 і 1893 гг. у значнай ступені абумовіў выцясненне беларускага збожжа з яго традыцыйных рынкаў збыту. Акрамя таго, гэтыя тарыфы садзейнічалі наплыву ў Беларусь хлеба з цэнтральна-чарназёмных губерняў.

Аграрны крызіс прывёў да структурнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі Беларусі. Гэта праявілася перш за ўсё ў змене спецыялізацыі сельскагаспадарчай вытворчасці ў жывёлагадоўчым кірунку. На мяжы XIX–XX стст. Беларусь становіцца раёнам развітой малочнай гаспадаркі. У 90-х гг. тут налічвалася больш за 200 прадпрыемстваў па перапрацоўцы малочнай прадукцыі, якая пастаўлялася ў розныя рэгіёны Расіі і за мяжу. У гады аграрнага крызісу ў памешчыцкіх гаспадарках вырасла значэнне вінакурэння. Пасля спаду, выкліканага ўвядзеннем з 1863 г. акцызнай сістэмы, з другой паловы 80-х гг. пачаўся рост вінакурнай вытворчасці. У пачатку 90-х гг. яе валавы аб'ём узрос на 67 % у параўнанні з першай паловай 60-х гг. XIX ст. Аграрны крызіс прывёў да інтэнсіфікацыі вытворчасці ў памешчыцкіх і некаторых сялянскіх гаспадарках, пачала шырока выкарыстоўвацца ўдасканаленая сельскагаспадарчая тэхніка.

Развіццё мясамалочнай жывёлагадоўлі паўплывала на структуру пасяўных плошчаў, садзейнічала пашырэнню травасеяння. За апошняе дваццацігоддзе XIX ст. іх агульная плошча павялічылася ў 7,7 разоў, і беларускія губерні па ўдзельнай вазе кармавых культур у агульнай пасяўной плошчы выйшлі на трэцяе месца пасля Прыбалтыкі і прывісленскіх губерняў. Узрасла таксама вытворчасць тэхнічных культур, сярод якіх першае месца займала бульба, што ў сваю чаргу прывяло да паляпшэння тэхнічнай аснашчанасці сельскай гаспадаркі і павышэння ўзроўню агратэхнікі.

Першыя два дзесяцігоддзі пасля адмены прыгоннага права былі дастаткова складанымі для памешчыцкіх гаспадарак, аднаку 1880–1890-х гг., нягледзячы на стан аграрнага крызісу, яны ў большасці сваёй паступова пачалі прыстасоўвацца да рыначных адносін. Землеўласнікі вымушаны былі выкарыстоўваць удасканаленую тэхніку ў сельскагаспадарчай вытворчасці. Яны паступова перайшлі на вырошчванне тэхнічных культур, травасеянне. Важнай і распаўсюджанай галіной вытворчасці памешчыцкіх гаспадарак беларускіх губерняў стала інтэнсіўная жывёлагадоўля, была створана вялікая колькасць конезаводаў. Больш як удвая тут павялічылася колькасць буйной рагатай жывёлы. З 80-х гг. XIX ст. у памешчыцкіх гаспадарках дастаткова хуткімі тэмпамі развівалася малочна-таварная жывёлагадоўля.

На думку М. Доўнар-Запольскага, на мяжы 80–90-х гг. XIX ст. адбыўся пералом у сацыяльна-эканамічным развіцці Беларусі. У гэты час зніжаецца зямельная забяспечанасць у пераліку на адзін сялянскі двор [3, с. 233]. У сельскай гаспадарцы значна павялічылася колькасць лішняй працоўнай сілы, узрасла цяга сельскага насельніцтва да адыходных промыслаў. Цэны на зямлю хутка падымаюцца, набываючы спекулятыўны характар [179, с. 234]. Натуральным вынікам працэсу капіталізацыі стала збядненне вёскі. Запаволены рост гарадской прамысловасці не даваў магчымасці паглынуць лішнюю працоўную сілу вёскі [3, с. 235]. Расійскі эканаміст пачатку XX ст. А. Каўфман адной з прычын вастрыні аграрнага пытання лічыў імкненне сялян апрацоўваць зямлю больш і шырэй, замест таго каб лепш. Сказвалася векавая традыцыя сялян, калі ў іх ёсць зваротныя сродкі, накіроўваць іх не на паляпшэнне сваёй гаспадаркі, а на яе пашырэнне [4, с. 140]. Дадзеная заўвага А. Каўфмана можа ўспрымацца з пэўнымі агаворкамі, звязанымі са стартавымі магчымасцямі сялянскіх гаспадарак, у тым ліку ступенню ўрадлівасці іх глеб.

З аграрным крызісам па часе супалі многія сацыяльныя працэсы ў сялянскім асяродку. На мяжы 70–80-х гг. XIX ст. А. Кіркор адзначаў пашырэнне сямейных перадзелаў сярод сялянства, непазбежнасць дадзенага працэсу [5, с. 214]. У газеце «Минский листок» 25 лютага 1892 г. паведамлялася: «Уварванне індывідуалізму ў сялянскую сям'ю, усе члены якой яшчэ нядаўна складалі адзінае цэлае, якое дэспатычна кіравалася старэйшым членам, робіць вялікія поспехі. Сямейныя раздзелы цяпер ужо звычайная з'ява і рэдка можна сустрэць сям'ю, якая трымаецца дзедаўскіх запаветаў» [1, с. 188–189]. С. Каваль з Горацкага павета ў сваёй карэспандэнцыі, апублікаванай ў кастрычніку 1911 г. на старонках «Нашай нівы», вельмі спачувальна адгукнуўся аб ранейшых традыцыях вялікай беларускай сям'і: «Калісь сяляне жылі вялікімі сем'ямі, ня дзелячыся. Старшым лічыўся бацька. Ён ведаў парадак… Цяпер ні так! Ажаніў бацька сына дык і аддзеляй; другога ажаніў – і яго аддзеляй. Пры дзяльбе сваркі ды бойкі» [7, с. 558–559]. У канцы XIX ст. пераважала ўжо малая, нуклеарная сям'я [9, с. 50]. Сямейныя раздзелы дазваляліся адпаведна пісьмоваму прыгавору сельскай грамады, але большай часткай яны адбываліся самавольна. У Віленскай губерні да 1883 г. падзялілася каля 29 тыс. сялянскіх двароў (амаль 34 % ад іх колькасці). Паказальна, што падзелы, якія был іправедзены афіцыйным шляхам, складалі толькі 4 % [6, с. 62]. У Віцебскай губерні ў 1899 г. было зафіксавана 445 сямейных раздзелаў, у тым ліку 224 без дазволу сельскай грамады. Аналагічная сітуацыя была ў Магілёўскай губерні [6, с. 63]. Побач з пераважаючай малой сям'ёй мела месца і нераздзеленая, галоўным чынам бацькоўская адналінейная. Нераздзеленымі заставаліся пераважна заможныя сем'і. Сямейныя раздзелы суправаджаліся скарачэннем дзетнасці сямей. Прычынамі сямейных раздзелаў М. Доўнар-Запольскі вызначаў збядненне сям'і, малазямелле, неўраджаі, цяжкасці з пошукам працы, якія дапаўняліся даволі значнымі падаткамі, якія абцяжарвалі бюджэт селяніна [2, с. 63]. У канцы XIX ст. беларусы ўсё часцей сталі звяртацца да пісьмовага завяшчання маёмасці [2, с. 67]. Правы на маёмасць селянін набываў толькі пасля ўтварэння ўласнай сям'і, пасля жаніцьбы. Традыцыйнае права беларускіх сялян было пабудавана такім чынам, што нерухомая і рухомая маёмасць рэдка заставаліся без прамога спадчынніка [2, с. 71]. Права жанчыны на атрыманне ў спадчыну зямлі залежала ад таго, пераходзіла яна ў іншую сям'ю ці не. У першым выпадку яна не атрымлівала частку зямельнага ўладання. І. Сербаў адзначаў, што жанчына ў беларусаў-сакуноў, якія жылі ўздож рэк Пціч і Арэса, карысталася аднолькавымі правамі з

мужчынамі. Удава валодала маёмасцю мужа і ўдзельнічала ў агульных сходах сельскіх жыхароў [8, с. 48].

Аграрны крызіс наклаў адбітак на кірунак і эфектыўнасць рэалізацыі ўрадавых мерапрыемстваў на тэрыторыі Беларусі. Перш за ўсё, гэта датычыцца абмежавальных законаў у дачыненні яўрэяў і католікаў. Адносна эфектыўнасці прымянення іх у час крызісу буйны землеўласнік Мінскай губерні Э. Вайніловіч адзначаў: «Яўрэі, якіх застаў у вёсках закон 1882 года, пражывалі на так званых запушчаных пляцах і ўчастках, якія засталіся за памешчыкам пасля надзялення сялян; яны там пражывалі як трымальнікі патэнтных ці беспатэнтных кабакоў, якія здаваліся ў арэнду заўсёды па пісьмовых дамовах. Пасля 3 мая 1882 г. вотчыннаму ўладальніку пустэчаў і карчомных пабудоў заставалася адно з двух: ці прыбраць яўрэя з пабудоў і сядзібы, ці ігнараваць закон і дазволіць яўрэю жыць на ранейшых умовах. Большасць уладальнікаў выбрала гэты другі выхад не толькі па прычыне дабрадушнасці і спагады да пастаўленых па-за законам, што, аднак, часта магло мець месца, паколькі нярэдка некалькі пакаленняў так званых шынкароў зжылося і несла службу столькім жа пакаленням вотчыннікаў» [10, с. 90–91]. Часта высяленне яўрэя было немагчымым з прычыны фінансавай залежнасці вотчынніка ад шынкара як крэдытора ці паслужлівага фактара. На практыцы аказвалася, што гэта было адзіна прымальнае выйсце для землеўласнікаў, паколькі ў іншым выпадку ён вымушаны быў гадамі судзіцца з арандатарамі.

Пытанне аб уплыве на беларускую вёску сусветнага аграрнага крызісу 80-х гг. XIX ст. застаецца да канца не вырашаным. Характарыстыка змены спецыялізацыі сельскагаспадарчай вытворчасці ў Беларусі, перабудова сялянскіх гаспадарак пад патрабаванні рынку не акрэслівае ўсёй палітры пытанняў, звязаных з уздзеяннем аграрнага крызісу. Застаецца ў баку ад навуковых праектаў гісторыкаў неабходнасць сістэмнага аналізу трансфармацый у эканоміцы пад уплывам аграрнага крызісу, фарміравання прадпрымальніцкага светапогляду ў суб'ектаў гаспадарчага жыцця таго часу, эвалюцыі памешчыцкай гаспадаркі і г. д.

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ

1. Белоруссия в эпоху капитализма : сб. док. и материалов : [в 2 т.] / Гл. арх. упр. при Совете Министров БССР, Ин-т истории Акад. наук БССР. Минск : Наука и техника, 1983–1990. Т. 1: Развитие капитализма в сельском хозяйстве Белоруссии / сост.: В. И. Мелешко [и др.]; ред.: К. И. Шабуня, В. Н. Жигалов. 1983. 272 с.

2. *Довнар-Запольский М. В.* Очерки семейственного права крестьян Минской губернии. М. : Типо-литогр. К. Ф. Александрова, 1897. 78 с.

3. *Довнар-Запольский М. В.* Народное хозяйство Белоруссии, 1861–1914 гг. Минск : Изд. Госплана БССР, 1926. 239 с.

4. Кауфман А. А. Аграрный вопрос в России: курс нар. ун-та. 2-е, доп. изд. [М.] : Моск. науч. изд-во, 1918. 268 с.

5. *Киркор А. К.* Литовское Полесье // Живописная Россия: Отечество наше в его земельном, историческом, племенном, экономическом и бытовом значении [в 12 т.] / под ред. П. П. Семенова. СПб. ; М., 1882. Т. 3, ч. 1. С. 3–218.

6. *Панютич В. П.* Социально-экономическое развитие белорусской деревни в 1861–1900 гг. ; Акад. наук Беларуси, Ин-т истории; науч. ред. П. Г. Козловский. Минск : Навука і тэхніка, 1990. 375 с.

7. *Саўка Каваль. С.* Хоміно // Наша Ніва: першая беларус. газ. з рыс. Факс. выд. [Мінск, 2003]. Вып. 4: 1911. С. 558–559.

8. *Сербов И. А.* Белорусы-сакуны: крат. этногр. очерк. Петроград : Тип. Императ. Акад. наук, 1915. [2], II, XVII. 180 с.

9. Сям'я і сямейны быт беларусаў / В. К. Бандарчык [і інш.]; Акад. Навук Беларус. ССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. Мінск : Навука і тэхніка, 1990. 256 с.

10. Труды местных комитетов о нуждах сельскохозяйственной промышленности: [в 58 т.]. СПб. : Тип. И. Гольдберга, 1903–1904. Т. 21: Минская губерния. VIII. 435 с.

***Ковяко И. И.***

*УО «Белорусский государственный педагогический университет имени Максима Танка» (г. Минск, Республика Беларусь)*

## ОСНОВНЫЕ ПОДХОДЫ В АНГЛО-АМЕРИКАНСКОЙ ИСТОРИОГРАФИИ К АНАЛИЗУ НОВОЙ ВОСТОЧНОЙ ПОЛИТИКИ В. БРАНДТА

Память об историческом прошлом Германии, укрепление позиций ФРГ в интеграционных структурах Запада, изменения в международной политике великих державв 1960–1980-х гг. – все это способствовало актуализации германского вопроса в новом измерении и неразрывно связывало анализ новой восточной политики канцлера Вилли Брандта с изучением германской проблемы в целом. Начиная со второй половины 1960-х гг. в Великобритании и США появилось значительное количество публикаций, посвященных исследованию новой восточной политики и ее последствий для западного мира. Формирование основных подходов к изучению проблемы согласовывалось с изменениями формы гер-